Браты меншыя

# «Яны проста дзікія па прыродзе!»


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЧАМУ ЯНОТУ НЕ МЕСЦА Ў КАНТАКТНЫМ ЗААПАРКУ

**Добрая навіна: Мінпрыроды выступіла з прапановай забараніць выкарыстанне дзікіх жывёл у кантактных і перасовачных заапарках. Забарону плануюць уключыць у праект Закона «Аб абыходжанні з жывёламі», які ўжо даўно абмяркоўваецца. Чаму яе не ўнясуць ва ўжо існае прыродаахоўнае заканадаўства, і што будзе з янотамі, мядзведзямі і іх дзікімі сабратамі пасля прыняцця дакумента — на гэтыя і іншыя пытанні адказала кансультант аддзела біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Тацццяна ЖАЛЯЗНОВА.**

***— Кантактныя заапаркі з'явіліся ў нас каля двух гадоў таму. Чаму толькі зараз Мінпрыроды выступае з ініцыятывай аб іх забароне?***

— З прапановай забараніць выкарыстанне дзікіх жывёл у кантактных заапарках мы выйшлі адразу, як толькі такія звярынцы з'явіліся. Тады ж мы ўнеслі папраўкі ў праект закона, які прыйшоў да нас на ўзгадненне. Мы лічым, што выкарыстанне дзікіх звяроў у кантактных заапарках — гэта няправільна, бо апрыёры прыручыць іх, каб яны камфортна сябе адчувалі ў няволі, немагчыма. На шчасце, у нас няшмат выпадкаў, калі жывёлы кусалі людзей, але яны ўсё ж ёсць. І гэта не таму, што жыхары заапаркаў нейкія няправільныя. Яны проста дзікія па сваёй прыродзе!

***— Перасовачныя звярынцы ўжо таксама не першы год плануецца забараніць?***

— А вось гэтае патрабаванне мы ініцыявалі нядаўна. Падставай паслужылі парушэнні, заўважаныя ў Тульскім перасовачным заапарку. Неабыякавыя людзі праінфармавалі нас пра тое, што жывёлы ўтрымліваюцца там у неналежных умовах, і мы адразу ж выехалі на месца з праверкай. Высветлілася, што ўсе прабывальнікі звярынца трапляюць пад дзеянне міжнароднага дагавора СІТЭС і на іх патрэбны дазвольныя дакументы. Дакументаў нам не прад'явілі, а ўмовы ўтрымання жывёл былі відавочна парушаныя. Гэтаму звярынцу быў выпісаны штраф па двух артыкулах, а таксама выдадзены прадпісанні па ліквідацыі ўсіх парушэнняў. Зараз мы высвятляем, выканалі яны іх ці не. Як бачыце, мы са свайго боку дзейнічаем аператыўна. Але распрацоўшчыкамі закона не з'яўляемся, таму і паўплываць на час яго прыняцця не можам.

***— Ці часта да вас паступаюць скаргі на кантактныя і перасовачныя звярынцы?***


Фота БЕЛТА.

— Мы ўдзячныя ўсім неабыякавым людзям за своечасовае інфармаванне і скаргамі гэта не лічым. Стараемся рэагаваць на ўсе заклікі грамадскасці, паколькі не заўсёды можам ведаць, што адбываецца ў аддаленых рэгіёнах Беларусі. Вядома, любая заява павінна падмацоўвацца фактамі, а не проста фразамі «таму што гэта няправільна» або «мне гэта не падабаецца». У цэлым, падобных звароту не так шмат, але гэта з улікам, што пішуць нам, у асноўным, калектыўна. Так, наконт кантактных заапаркаў за апошнія два гады мы атрымалі шэсць зваротаў і прыкладна столькі ж — датычна перасовачных звярынцаў у канцы 2017 года.

У выніку праверак мы прыйшлі да высновы, што ні кантактныя, ні перасовачныя заапаркі не могуць забяспечыць дзікім жывёлам належныя ўмовы, якія прапісаны ў нашым заканадаўстве.

***— А што гэта за ўмовы?***

— У пастанове Мінпрыроды № 16 прапісаны нормы па ўтрыманні дзікіх жывёл. Калі казаць проста, то кожнага жыхара заапарка варта забяспечыць паілкай, месцам для кармлення, спецыяльным навесам, куды ён можа схавацца. У рацыёне павінна прысутнічаць неабходная колькасць бялкоў і вітамінаў, пры гэтым ежа павінна адпавядаць той, якую жывёла атрымлівае ў дзікай прыродзе. Усё гэта мы правяраем. Таксама мы звяртаем увагу на выкананне патрабаванняў наконт тэмпературы, вільготнасці і ўльтрафіялету. Многія не звяртаюць увагі на асвятленне, думаючы, што гэта ніхто не заўважыць. За такія парушэнні мы выпісваем штрафы, якія значна вышэй за кошт ультрафіялетавай лямпы.

***— Ці шмат штрафаў было выпісана апошнім часам, і ці прадугледжаны новым праектам іншыя пакаранні?***

— На самай справе дзікіх жывёл у кантактных і перасовачных звярынцах у нас не так шмат, і практычна ўсіх мы ведаем «у твар». Таму штрафы выпісваюцца рэдка. Мы стараемся весці актыўную прапагандысцкую работу. Што датычыцца пакарання, то пакуль па заканадаўстве прадугледжаны толькі штрафы, таксама жывёла можа адбірацца ў выпадку яе незаконнага правазу па тэрыторыі нашай краіны. У новым законе прадугледжана канфіскацыя і ў выпадку парушэння патрабаванняў утрымання.

***— Што будзе з дзікімі жывёламі, якія ўсё жыццё пражылі ў заапарку, пасля ўступлення новага закона ў сілу?***

— Яны і далей будуць жыць у заапарках, толькі іншых, якія змогуць забяспечыць для іх усе неабходныя ўмовы. Паўтаруся, у нас цяпер у звярынцы не так шмат дзікіх жывёл, каб з гэтым узніклі праблемы.

***— Чаму папраўкі ўносяцца не ў існае прыродаахоўнае заканадаўства, а ў новы законапраект?***

— Закон «Аб абыходжанні з жывёламі» закранае не толькі дзікіх звяроў, а жывёл у цэлым. Кантактныя і перасовачныя заапаркі — гэта камбінацыя ўсіх жывёл, і каб вырашыць праблему комплексна, мы ўносім свае прапановы ва ўжо падрыхтаваны законапраект.

**Кацярына ЦІТОВА**

У свеце раслін

# Не купляйце першацветы!

### Невялікі букецік — значны «ўнёсак» у знішчэнне прыроды

**Прыгожыя, а галоўнае, першыя кветкі так і прывабліваюць «пераходных» гандляроў. Толькі ў лесе зацвітуць першацветы, як з усіх бакоў табе прапануюць набыць яркі букецік з пралесак ці духмяны пучок чарамшы.**

**І кожны год абаронцы прыроды стараюцца спыніць незаконны гандаль, каб захаваць рэдкія расліны, якія і ў лесе цвітуць менш за месяц, а ў сарваным выглядзе пражывуць не больш за два дні. Таму ведайце, калі купляеце букецік чырванакніжнікаў — падтрымліваеце знішчэнне прыроды.**

Вядома, вырасціць першацветы можна і дома, але гандляры выбіраюць больш просты шлях — узяць іх з лесу. Па словах **загадчыка сектара кадастру расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алега МАСЛОЎСКАГА,** толькі 5 % з усіх вулічных гандляроў маюць неабходныя дакументы для продажу, астатнія з'яўляюцца нелегаламі. І самы дзейсны спосаб барацьбы з імі — не павышаць попыт на такі тавар.

— Сёння вы купіце букецік, а заўтра гэты гандляр вынесе з лесу яшчэ больш кветак, а побач з'явяцца такія ж нелегалы. Не сакрэт, што калі ёсць попыт — ёсць і прапанова, — адзначыў Алег Маслоўскі. — Вось ва Украіне, напрыклад, тымі, хто гандлюе чырванакніжнікамі, займаюцца грамадскія арганізацыі: штрафы яны, вядома, не выпісваюць, а вось прысароміць могуць. Лічу, што і ў нас трэба праводзіць прафілактычныя размовы, а не толькі штрафаваць. Паколькі на ўсіх інспектараў не хопіць.

У Чырвоную кнігу Беларусі ўключаны пакуль толькі дзесяць відаў першацветаў: раўнаплоднік пылюшнікавы, сон расчынены (сон-трава), сон лугавы, чубатка пустая, чубатка прамежкавая, фіялка багнавая, медуніца вузкалістая, медуніца мякенькая, гусіная цыбуля пакрывальцавая і чарамша. Акрамя гэтага, ёсць віды са Спіса раслін і грыбоў, якія маюць патрэбу ў прафілактычнай ахове, бо пры масавым знішчэнні і яны могуць папоўніць шэрагі чырванакніжнікаў. Самыя вядомыя з іх: пралеска высакародная, першацвет высокі, воўчнік звычайны, белакапытнік гібрыдны, падснежнік беласнежны.


Пралеска высакародная.
Фота Анастасі ЛЯЎКОВІЧ.

— Першацветы вельмі ўразлівыя расліны, паколькі яны расцвітаюць першыя і жывуць усяго два-тры тыдні. За гэты кароткі перыяд ім патрэбна паспець назапасіць насенне на наступны год, пакуль іх не заглушыць трава. А масавы збор першацветаў падрывае колькасць іх папуляцый і здольнасць да вегетацыі. Яны не паспяваюць размножыцца, — падкрэсліў спецыяліст. — Таму не трэба ўвогуле чапаць першацветы. Ёсць жа шмат садовых кветак, а першацветамі любуйцеся ў прыродзе!


Фота Ірыны СЫСОЙ.
Сон расчынены.

Зараз вучоныя імкнуцца захаваць вясновыя расліны на тых тэрыторыях, дзе яны амаль зніклі. Асабліва гэта датычыцца буйных гарадоў — асноўных месцаў гандлю. Для таго каб высветліць, якія аб'екты трэба ўзяць пад ахову ў першую чаргу, **навуковы супрацоўнік Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі Анастасія ЛЯЎКОВІЧ** навучылася «прадказваць» лёс першацветаў. Пры дапамозе матэматычных разлікаў яна можа вылічыць, колькі раслін засталося на той ці іншай тэрыторыі, а таксама якія з іх знаходзяцца ў крытычным стане.

* * *

Мінпрыроды папярэджвае, што ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце», забараняюцца самавольныя канфіскацыі і перасадкі дзікарослых раслін, якія адносяцца да відаў, уключаных у Чырвоную кнігу, з асяроддзя іх росту, іх незаконны абарот, а таксама выдаленне і ўчыненне іншых дзеянняў, якія могуць прывесці да іх гібелі, скарачэння колькасці або парушэння асяроддзя іх росту.

За парушэнне гэтых патрабаванняў вінаватыя асобы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 15.8 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і караюцца штрафнымі санкцыямі ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь.

**Кацярына КІРЭЕВА**